УДК 821.161.3.09-3

# ФІЛАСОФСКА-АЛЕГАРЫЧНЫ РАМАН К. ЧОРНАГА: ПРАБЛЕМА СВЕТУ И ЧАЛАВЕКА

***Вольга Жылевіч***
*Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, Пінск, Беларусь*
jilevitch@gmail.com

У артыкуле разглядаюцца прынцыпы адлюстравання чалавека і света на вайне ў філасофска-алегарычным рамане. Матэрыялам для аналізу з’явіўся твор беларускага пісьменніка К. Чорнага “Млечны шлях”, як вельмі яскравы ўзор рэпрэзентацыі ваеннай праблематыкі скрозь прызму філасофскай думкі.

***Ключавыя словы: мадыфікацыя, алегорыя, мадэляванне, быццё, светаўспрыманне, філасофскі раман, міфалагізм.***

# K. CHORNY’S PHILOSOPHICAL AND ALLEGARY NOVEL: THE PROBLEM OF THE WORLD AND PERSON

***Olga F. Jilevich***
*Polessky State University, Pinsk, Belarus*

The article deals with the principles of portraying a person in a war in a philosophical and allegorical novel. The material for the analysis was the work of the Belarusian writer K. Chorny “The Galaxy Way”, as a very vivid example of the representation of military issues through the prism of philosophical thought.

***Keywords: modification, allegory, modeling, being, worldview, philosophical novel, mythologism.***

Філасофска-алегарычны раман – сінтэтычная жанравая мадыфікацыя, у якой мастацкае, вобразна-іншасказальнае асэнсаванне рэчаіснасці спалучаецца з навукова-лагічным яго мадэляваннем. На працягу ўсяго ХХ стагоддзя гэтыя розныя формы спасціжэння свету наблізіліся ў некаторых філасофскіх кірунках.

Да гэтага перыяду філасофія не даследавала асобу буйным планам, а займалася, галоўным чынам, пошукамі агульных заканамернасцяў быцця. Таму паміж філасофіяй і мастацкай літаратурай існаваў значны разрыў. Аднак калі многія заходнееўрапейскія філосафы зрабілі ключавым аб'ектам свайго аналізу быццё чалавека, то бок менавіта тое, што заўсёды было прэрагатывай пісьменнікаў, разрыў значна скараціўся. Гэта садзейнічала больш шырокаму і натуральнаму ўзаемапранікненню філасофіі і літаратуры.

На думку М. М. Зіндэ, “філасофія можа ўваходзіць у твор рознымі спосабамі” [1, с. 5]. З аднаго боку, яна непасрэдна аказваецца на старонках белетрыстыкі ў аўтарскіх адступленнях, у спрэчках або развaжаннях персанажаў, але не закранае апавяданне на сюжэтным узроўні. Ствараючы інтэлектуальна насычаную атмасферу, падвышаючы ўдзельную вагу аналітычнага пачатку, філасофія ў гэтым выпадку ўсё ж такі не вызначае манеру паводзін герояў, застаецца вонкавай па стаўленні да мастацкага зместу твора, а часта яшчэ і значна аслабляе яго апавядальную канву.

З іншага боку, аўтары ажыццяўлялі сінтэз філасофскага і мастацка-іншасказальнага на ўзроўні структуры твора. Філасофскі тэзіс вызначаў спосаб мыслення герояў, іх учынкі і паводзіны. Такім чынам, у аснове сучаснага філасофска-алегарычнага рамана знаходзіцца мастацка-філасофская думка, аформленая з дапамогай алегорыі, і сфарміраваная па вобразна-паняційных прынцыпах адлюстравання мыслення сваёй эпохі. Алегорыя ў дадзеным выпадку ўяўляе сабою не адзінкавы троп, а ўяўляе сабою апавяданне, якое арганізуе ўвесь твор цалкам, элементы якога ўтрымоўваюць сімвалічныя значэнні, якія ляжаць у аснове яго другога значэння.

Як адзначае К. Вандэндорп, “у філасофска-алегарычным творы зліваюцца разам лагічнае паняцце, канкрэтны вобраз і маральная схема” (Тут і далей пераклад наш – В. Ф. Жылевіч) [2, с.16]. У той ці ступені ў алегорыі канкрэтнае аблічча з’яў спрашчаецца або дэфармуецца для пэўнасці выказвання аўтарскай думкі. Таму ў такім творы сціраецца жыццёвая разнастайнасць эпічнага рамана і ствараецца больш-менш штучны мастацкі свет.

У XX стагоддзі для вырашэння сваіх мастацка-эстэтычных ідэй да філасофска-алегарычнага рамана звярталіся і працягваюць звяртацца такія аўтары як Дж. Голсуорсі, А. Жыд, Т. Ман, Л. Пірандэла, Г. Уэлс, Т. Фантане, А. Франс, Ж. -П. Сартр, А. Камю, А. дэ Сэнт-Экзюперы, М. Гарэцкі, Веркор, А. Мердак, Г. Гарсія Маркес, К.Чорны, В. Быкаў, Ул. Караткевіч, П. Зюскінд, Ж.-М. Г. Леклезіё, М. Турнье, С. Жэрмэн. “Мастацкая філасофія кожнага з аўтараў – гэта спроба аб’яднаць у творах філасофскую, навуковую і мастацкую карціны свету, зыходзячы з яе ўніверсальнасці, або набліжаючыся да яе” [3, с. 64]. Нягледзячы на відавочную распаўсюджанасць філасофска-алегарычнага рамана, многія яго спецыфічныя асаблівасці да гэтага часу не распрацаваны на належным узроўні.

*Мэта дадзенага артыкула* – прааналізаваць прынцыпы адлюстравання чалавека на вайне ў філасофска-алегарычным рамане беларускага пісьменніка К. Чорнага “Млечны шлях” (1944), як вельмі яскравы ўзор рэпрэзентацыі ваеннай праблематыкі скрозь прызму філасофскай думкі.

Ваенныя падзеі XX стагоддзя – рэвалюцыі, Першая і Другая сусветная вайна, “халодная вайна”, вайна ў Косава, Чачні, Іраку, “аранжавыя рэвалюцыі” – пакінулі жахлівы след у гісторыі чалавецтва. Вайна супярэчыць чалавечай натуры, але ў той жа самы час чалавек прадстаўлены ў межах духоўнай і фізічнай улады. Філасофскі раман, як гібкі і мнагамерны літаратурны жанр, дае магчымасць адлюстраваць шматаспектнасць чалавечага існавання ва ўмовах ваеннай рэчаіснасці ў кантэксце філасофскіх думак і светапогляду пісьменнікаў.

У філасофіі прыроду вайны, у прыватнасці дылемы “мір-вайна”, “дабро-зло”, “насілле-ненасілле” даследавалі ў розныя перыяды – ад Арыстоцеля і да П. Сарокіна. Як вядома, існуе некалькі канцэпцый філосафаў на прыроду вайны і міру:

1. Л. Талстой, М. Гандзі, М.-Л. Кінг, А. Фарчун, А. Гусейнаў і іншыя прытрымліваюцца думкі, што вайна – гэта абсалютнае зло, ад яе неабходна цалкам адмовіцца. Ідучы за хрысціянскім вучэннем аб ненасіллі, Л. Талсты актыўна выказваўся за “абсалютны мір”. Амерыканскі даследчык А. Фарчун лічыць, што нават у сітуацыях, якія пагражаюць жыццю чалавека, ён не павінен скарыстоўваць жорсткасць у адказ [4, с. 185].

Канцэпцыю Л. Талстога працягваюць М. Гандзі і М.-Л. Кінг, якія распрацоўваюць пацыфізм – рух за мір ва ўсім свеце ў яго разнастайных варыянтах. Яны прапаноўвалі альтэрнатыву вайне ў ненасільнай форме супраціўлення ворагу, сэнс якога заключаецца не ў пакорнасці, а ў здольнасці бакоў знайсці кампраміс і мабілізаваць сілы духа кожнага чалавека. Такі падыход уключае цэлы комплекс мер – дыпламатычных перагавораў, мірных выступленняў, выкарыстанне аратарскіх прыёмаў, спецыяльнай методыкі ненасільных дзеянняў.

2. Вайна можа быць справядлівай. Яна дапускаецца, хаця з’яўляецца сумнай неабходнасцю. Таму патрэбна памятаць пра ваенную дабрачыннасць, выхоўваць тых, хто павінен абараняць Айчыну. Так лічаць І. Ільін, С. Булгакаў.

У процілегласць Л. Талстому, І. Ільін крытыкуе вучэнне рускага мысляра за абсалютнае адмаўленне насілля і вайны. Ён робіць акцэнт на мужнасці і гераізму, як ключавых каштоўнасцях у праваслаўнай, свецкай і воінскай этыкі. Вучоны лічыць, што неабходна паважаць свайго ворага, але ён не выступае супраць вайны. На яго думку, вайна – цяжкая неабходнасць, але ён таксама адмоўна адносіцца і да пацыфізму [5, с. 163].

3. Вайна можа мець месца толькі ў крайнім выпадку, хаця можа быць і справядлівай. У вырашэнні спрэчных палітычных пытанняў неабходна аддаваць перавагу дыпламатычным метадам, выхаванню высокай маральнасці, а таксама ўмацаванню сілы веры і духа. Прыхільнікамі гэтай канцэпцыі выступаюць У. Салаўёў, Г. Нібур, А. Кавалёў, Ф. Мейерс. Яны лічаць, што не трэба ні ў якім выпадку адмаўляць сэнс ненасілля падчас урэгулявання палітычных адносінаў. Да вайны можна прыбягаць толькі ў самых выключных выпадках, піша ён.

На думку А. Кавалёва, гармонія ў грамадстве – гэта калі суіснуюць насілле і ненасілле, дабро і зло [6, с. 260]. Ён лічыць, што дабро і зло рэгулююцца самой прыродай, насілле і зло патрэбны ў разумных межах.

Такім чынам, пералічаныя канцэпцыі заснаваны на асэнсаванні вопыта XX стагоддзя. З аднаго боку, даследчыкі цалкам адмаўляюць вайну, выказваюць неабходнасць данесці да грамадства рознымі сродкамі ідэі ненасільнага супраціўлення і дыпламатычнага вырашэння міжнародных канфліктаў. З іншага боку, некаторыя сучасныя вучоныя вопыт ненасілля ўспрымаюць або як утопію, або як дактрыну.

Абодва пісьменніка былі непасрэднымі сведкамі ваенных дзеянняў. К. Чорны – Другой Сусветнай вайны, Ж.-М. Г. Леклезіё праходзіў ваенную службу ў Тайландзе падчас канфліктаў у яе паўднёвай частцы.

К. Чорны – актыўны публіцыст, ён выказваў свае сацыяльна-грамадскія погляды ў артыкулах, нарысах, эсэ. Захавалася мноства зваротаў, памфлетаў і палітычных фел’етонаў К. Чорнага, у якіх пісьменнік заклікаў суайчыннікаў на барацьбу з захопнікамі. Пісьменнік прызнаваўся, што да вайны ён прытрымліваўся пацыфісцкіх поглядаў, але калі паўстала пагроза фашызму, зразумеў, што трэба ваяваць, трэба даць адпор фашысцкай арміі і самой ідэалогіі фашызму. Ён верыў у сілу грамадскай думкі, верыў і ў

тое, што чалавечае слова можа паўплываць на палітыку ўрада. Празаік лічыў, што перад тварам найстрашнейшай зброі людзі не могуць не ўсвядоміць, што напад любой краіны не дасць іншага выніку, акрамя ўсеагульнага знішчэння.

Беларускі аўтар перадаваў драматычныя ваенныя падзеі ў сваіх творах: у апавяданнях саракавых гадоў ("Маленькая жанчына", "Пrасторны дом", "Вялікае сэрца"), у раманах розных часавых перыядаў ("Вялікі дзень", 1941-1944, "Млечны шлях", 1944).

У філасофска-алегарычным творы "Млечны шлях" К. Чорнага адлюстроўваецца Другая сусветная вайна (1939-1945).

Аповед твора – неразгалінаваны, сюжэт уяўляе сабой універсальны пачатак сканцэнтраваны сітуацыі. У "Млечным шляху" няма маштабных вайсковых дзеянняў, уся напруга тэкста – у псіхалагічных маналогах, партрэтах і паводзінах герояў, атмасферы жывёльнага страху і тонкай мяжы паміж шчырасцю і здрадай.

Раман "Млечны шлях" – гэта гісторыя суіснавання двух сусветаў, праз якія аўтар на розных узроўнях засяроджвае ўвагу на адной і той жа праблеме. У рамане К. Чорнага першы сусвет складае светабачанне чатырох герояў-незнаёмых: немца, беларуса, паляка, чэха, якія выпадкова сыходзяцца ў адным пункце зямнога шару. Аб'яднаныя жаданнем выжыць, роўныя перад тварам дзіцяці, яны спавядаюцца, агаляючы раны душы. Другі сусвет – гэта вобраз Ганусі Сямагі, якая з'яўляецца сімвалічным увасабленнем гора і пакут, чысціні, няспыннасці жыцця.

У творы ключавую сэнсавую нагрузку нясе матыў блукання, які адцяняе філасофска-абагулены паказ рэчаіснасці. Гаворка ідзе пра блуканне людзей. У "Млечным шляху" у пачатку твора аўтар паказвае чатырох герояў – незнаёмых адзін аднаму, ён не называе іх імёнаў, не тлумачыць іх нацыянальную прыналежнасць, сацыяльнае становішча і тым самым свядома прымушае чытача разабрацца ў прычынах іх падазронасці. "Гэты другі меў такі выгляд, што не ўгадаць было б, колькі яму год. Можа ён быў стары, а можа зусім малады. <…> Але ўвага і насцярожанасць вельмі востра былі напісаны на яго твары. Цяжка было зразумець, ці гэта на быка, ці на чалавека ён нарыхтаваўся кінуцца." [7, с. 7] – піша аўтар.

Пісьменнік не называе месца, адкуль пачынаецца шлях герояў: "Рыжы бык адбіўся ад вялікай чарады, якую нямецкія салдаты гналі кудысьці на станцыю… Тут льга было прайсці вялікую прастору і не напаткаць чалавека і яго аселішча." [7, с. 8].

Сэнс блукання ў К. Чорнага заключаны ў мэце руху. У творы мае месца трагічны фінал. У К. Чорнага хада герояў прыводзіць да спаленай хаты і павешанай фашыстамі маці Уладзіміра Ярмаліцкага. Аўтар піша: "Ні Новак, ні Мікалай Сямага з Ганусяй не абазваліся і словам. Яны стаялі як анямелыя." [7, с. 119] Забойства Ярмаліцкім нямецкага салдата і разгубленасць герояў сведчаць аб тым, што вайна асуджвае людзей на бясконцае блуканне і немагчымасць здабыць шлях да радзімы, якую захапілі фашысты.

Ідэйна-філасофскі сэнс твора зашыфраваны таксама і ў сістэме сімвалаў і алегорый. Мастацкая ўмоўнасць дапамагае ў творы засяродзіцца на глабальных пытаннях сутнасці жыцця і прызначэння чалавека ў ваенных умовах. У К. Чорнага вобраз-аллегорыя *Млечнага Шляху* як імкненнем чалавека да светлай будучыні, дапамагае аўтару выкрыць самую сутнасць фашысцкай ідэалогіі. Вобразы-сімвалы адзінокай хаты як "Ноевага каўчэгу", вайны як сусветнага патопу ўвасабляюць аўтарскую філасофскую ідэю.

Такім чынам, прытчава-алегарычнае светаўспрыманне ў апавяданні – гэта маркер філасафічнасці тэксту. Апелiруючы да ўзнаўлення алегарычнай карціны свету, аўтар прытчавай формы ўніверсалізуе філасофскую праблематыку, падкрэслівае яе тэмпаральнасць і татальнасць у дыяхронным і сінхронным зрэзах.

Філасофскія пошукі беларускага пісьменніка характарызуюцца сувяззю з праблемамі часу і задачамі развіцця літаратуры. У філасофска-алегарычным рамане "Млечны шлях" К. Чорнага падымаюцца праблемы быцця і чалавечай асобы, гістарычныя падзеі асэнсоўваюцца скрозь прызму месца чалавека ў іх. Умоўна-алегарычны змест рамана дазваляе наблізіцца да спасціжэння ўнутранай ідэі.


1. Зинде, М. М. Творчество Уильяма Голдинга: (К проблеме философского аллегорического романа) : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.01.05 / М. М. Зинде. – Москва, 1979. – 15 с.
2. Vandendorpe, Ch. Allégorie et interprétation / Ch. Vandendorpe // Poétique. – № 117, février 1999. – P. 75-94.
3. Жылевіч, В. Ф. Французскі раман-прытча другой паловы XX стагоддзя: ад «вечных» пытанняў да сучасных праблем грамадства / В. Жылевіч // Веснік Палескага дзяржаўнага універсітэта. Серыя грамадскіх і гуманітарных навук. – 2009. – № 2. – С. 64–69. – DOI: https://elibrary.ru/item.asp?id=22999302
4. Fortune, A. Violence as Self-Sacrifice : Creative Pacifism in a Violent World / A. Fortune // Journal of Speculative Philosophy. – 2004. Vol. 18, № 3. – P. 184-192.
5. Ильин, И. А. О сопротивлении злу силою / И. Ильин // Бердяев Н.А. Кошмар злого добра. – М. : Наука, 2005. – 576 с.
6. Ковалев, А. М. Способ духовного производства в структуре общества / А. М. Ковалев. – М. : Наука, 2001. – 387 с.
7. Чорны, К. Зборнік твораў у 8 т. Т. 8 / К. Чорны. – М. : Маст. Літ., 1975. – Т. 8. – 616 с.